# Да 70-годдзя Вялікага Кастрычніка

А. Я. СУПРУН

## КАСТРЫЧНІК, ПЕРАБУДОВА І ГУМАНІТАРНАЯ АДУКАЦЫЯ

Наша краіна сустракае сямідзесяціголдзе Вялікага Кастрычніка ва ўмовах, калі ажыццяўляецца выпрацаваная партыяй і замацаваная XXVII з'ездам канцэпцыя рэвалюцыйнай перабудовы грамадства, якая накіравана на поўнае раскрыццё магчымасцей і пераваг сацыялістычнага ладу. Гэты працэсс, звязаны з паскарэннем сацыяльна-эканамічнага развіцця, абапіраецца на глыбокую дэмакратызацыю грамадства. Сацыялізм зможа раскрыць свае бязмежныя перспектывы ў тым выпадку, калі кожны чалавек будзе адчуваць сябе гаспадаром у сваёй краіне, калі кожны член грамадства будзе не пабочным назіральнікам, а актыўным удзельнікам рэвалюцыйнага абнаўлення сацыялізму. У СССР у імя чалавека, у імя таго, каб чалавек стаў гаспадаром сваёй краіны, свайго лёсу, здзяйснялася Кастрычніцкая рэвалюцыя. У імя чалавека здзяйсняецца зараз перабудова ўсяго нашага жыцця, заснаваная на рэвалюцыйных традыцыях Кастрычніка.

Грамадскія і эканамічныя пераўтварэнні, што адбываюцца ў нашай краіне, настойліва запатрабавалі ўдасканальвання ўсёй сістэмы народнай адукацыі, у прыватнасці, карэннага паляпшэння работы вышэйшай школы. Прынятыя партыйныя і дзяржаўныя дакументы вызначаюць асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай школы і рэгламентуюць важнейшыя прынцыповыя палажэнні яе развіцця.

Рэалізаваць намечанае, ажыццяўляць перабудову, аптымізацыю навучальна-выхаваўчага працэсу і ўдасканальванне навуковай дзейнасці павінны рабіць мы, усе тыя, хто **працуе** ў вышэйшай школе: прафесарска-выкладчыцкі састаў, студэнты, аспіранты, супрацоўнікі навуковых лабараторый, кіраўніцкі і дапаможны персанал. Без асабістага ўкладу кожнага не будзе і перабудовы, не будзе дэмакратызацыі, не будзе абнаўлення ўсяго грамадства, усёй вышэйшай школы і нашага універсітэта ў прыватнасці.

Гэта, мабыць, галоўная асаблівасць цяперашніх пераўтварэнняў: неабходнасць іх усеагульнасці. Неабходна перабудаваць усё наша жыццё. Пры гэтым, перабудову трэба пачынаць з сябе, са сваіх звычак, установак, са сваёй псіхалогіі. У мінулым прынята нямала пастаноў аб вышэйшай школе. І яны, безумоўна, садзейнічалі яе развіццю і ўдасканаленню, але адрасаваліся перш за ўсё кіраўніцтву вышэйшай школы, прафесарам і выкладчыкам. Цяперашняя рэформа адрасуецца не толькі ім, але, мабыць, у першую чаргу студэнтам, таму што стала зразумела: без сумеснай працы выкладчыкаў і студэнтаў не ўдасца дабіцца карэннага паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Вось чаму мы не агаварыліся, калі сказалі ў пачатку артыкула, што студэнт працуе ў ВНУ. Студэнт — гэта чалавек, які павінен за час знаходжання ў ВНУ навучыцца працаваць у выбранай галіне, навучыцца неабходнаму для гэтага запасу ведаў, навучыцца ўсё жыццё здабываць новыя веды, каб іх выкарыстоўваць у штодзённай дзейнасці. Без пастаяннай, няспыннай самаадукацыі не можа быць сучаснага высокакваліфікаванага спецыяліста, здольнага да вырашэння задач, якія ставіць перад ім шматграннае жыццё.

Галоўная ідэя сучаснай рэформы вышэйшай школы — у павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на аснове інтэграцыі адукацыі, навукі і вытворчасці. Універсітэтам у сістэме нашай вышэйшай адукацыі адведзена асабліва ганаровае месца. Яны закліка    ны, акумулiруючы навейшыя дасягненні навукі, умацоўваць навуковы патэнцыял краіны, станавіцца сапраўднымі цэнтрамі навукі, культуры, камуністычнага выхавання. Выпускнікі універсітэтаў павінны быць праваднікамі перадавой навуковай думкі ва ўсіх звеннях народнай адукацыі.

Гуманітарная адукацыя ўяўляе сабой важную частку універсітэцкай адукацыі. Гуманітарныя факультэты — неад'емная частка універсітэцкай сістэмы. Іх наяўнасць забяспечвае магчымасць сапраўднай інтэграцыі навукі, без якой немагчымы сучасныя веды. Вышэйшыя дасягненні ў любой фундаментальнай навуцы ў наш час немагчымы без пэўнай гуманітарнай асновы, таму што яны не могуць узнікнуць без праяўлення інтуіцыі вучонага, а гуманітарныя навукі — важнейшая школа інтуіцыі. Сумеснае (хоць, на жаль, і значна раз'яднанае па прычыне слабай сувязі паміж факультэтамі) навучанне прадстаўнікоў гуманітарных і прыродазнаўчых спецыяльнасцей надзвычай важна для падрыхтоўкі спецыялістаў любой галіны ведаў незалежна ад таго, будуць яны працаваць у навуцы, на вытворчасці ці ў школе.

Сферай прыкладання для гуманітарнай адукацыі з'яўляецца культура ў самым шырокім разуменні яе. Трэба прызнаць, што, нягледзячы на вялікія поспехі ў культурным будаўніцтве за 70 гадоў Савецкай улады, культура ў нас яшчэ ў дэфіцыце. Гэты дэфіцыт агульнай культуры, культуры працы быў адной з галоўных прычын нядаўніх трагедый у Чарнобылі і Навarасійску, бязладдзя на Байкале і на Ладазе. Гэта дэфіцыт культуры навуковага даследавання прывёў да недастаткова ўзважаных рашэнняў на Палессі і ў сярэднеазіяцкіх пустынях праблем воднай гаспадаркі і экалогіі. Гэта дэфіцыт культуры стаў прычынай страты шэрагу каштоўных помнікаў нашай культуры, такіх, напрыклад, як брэсцкія лісткі ятвяжскага слоўнічка ці барысовы камяні... Палітыка партыі накіравана на тое, каб пераадолець гэты дэфіцыт і дабіцца новага, небывалага ўздыму ўсеагульнай культуры ў нашай краіне.

Гуманітарная адукацыя ў школе, усеагульная гуманітарная адукацыя ў ВНУ закліка्ны стварыць надзейны фундамент культуры.

У гуманітарнай, як і ва ўсёй нашай адукацыі, выявілася ў апошнія дзесяцігоддзі захапленне паведамленнем гатовых ведаў і гатовых рэцэптаў у якасці панацэі ад усіх бед і на ўсе выпадкі жыцця. Мы пераканаліся, што гэта далёка не так. Цяпер ужо зразумела, што галоўная задача гуманітарнага навучання — не так паведаміць вялікую і ўсё ўзрастаючую суму звестак, як навучыць разбірацца ў фактах, у з'явах рэчаіснасці, у з'явах культуры.

Студэнтаў трэба вучыць разбірацца ў новых, якія не вывучаліся імі, творах літаратуры і мовы. Вучыць не прыклейваць у кагосьці спісаныя ярлыкі, а спакойна, па-дзелавому, з усёй глыбінёй і адказнасцю аналізаваць, выпрацоўваць сваю абгрунтаваную думку, калі неабходна — карэкціраваць яе, але рабіць гэта свядома і ўпэўнена.

Асаблівае месца ў гуманітарным навучанні займае фарміраванне ў грамадства гістарычнай памяці. Вільгельм Гумбальдт пісаў: «Хто не жадае мець мінулага, той не заслугоўвае будучага». Гэта глыбока правільная думка стала асабліва зразумелай цяпер, калі ўсё чалавецтва аказалася перад выбарам: ядзернае самазабойства ці без'ядзерны свет. Вялікі Кастрычнік адным з першых сваіх дэкрэтаў абвясціў: МІР НАРОДАМ! Вось чаму асабліва востра нашчадкі Кастрычніка вядуць барацьбу за мір, а разам з тым за гістарычную праўду і гістарычную памяць, якая робіць чалавека вартым сваіх папярэднікаў. Адна з найважнейшых задач гуманітарнай адукацыі — шырокае знаёмства нашых выпускнікоў з гісторыяй айчыннай і сусветнай культуры. Менавіта праз пазнанне роднай і сусветнай культуры, яе мінулага і сучаснага адбываецца станаўленне сапраўднага глыбокага патрыятызму і інтэрнацыяналізму.

Спецыялісты-гуманітарыі, якія рыхтуюцца зараз ва універсітэце, будуць працаваць у трэцім тысячагоддзі. Многія з іх на працоўным пасту сустрэнуць стагоддзе Вялікага Кастрычніка. Ім давядзецца не проста перадаваць культурную спадчыну мінулага, якую цяперашнім пакаленням, будзем спадзявацца, удасца зберагчы разам з чалавецтвам, але і разбірацца ў новых, яшчэ нябачаных з'явах літаратуры, мастацтва, навукі,

разнастайных праяўленнях культуры будучага. Павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне гуманітарных навук заключаецца ў тым, каб вучыць іх навыкам такога аналізу, выхоўваць у нашых выпускнікоў упэўненасць у правільнасці творчага марксіцкага вучэння.

Перад гуманітарыямі універсітэта, як і перад усёй нашай вышэйшай адукацыяй, стаіць задача ўсемагчымага развіцця універсітэцкай навукі, узрастання ролі ВНУ у павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы спецыялістаў. Нам неабходна рыхтаваць ідэйна сталых і грамадска актыўных спецыялістаў. Мы павінны засвоіць урок праўды і ўрок дзейснасці слова, аб якіх гаварылася на XXVII з'ездзе КПСС. Фарміраванне ўсебакова развітай асобы і яе навуковага светапогляду з'яўляецца неабходнай перадумовай далейшага павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў гуманітарнага профілю, дзейнасць якіх будзе спрыяць росту нашай культуры, прымнажэнню яе багацця, ажыццяўленню вялікіх ідэалаў Кастрычніцкай рэвалюцыі.